ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● ● NO. 45 (3501) ● ● ЧАЦВЕР, 1 СНЕЖНЯ , 2016

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: WWW.GOLAS.BY



**Парад памяці ў Самары**

Беларусы з горада на Волзе паўдзельнічалі ў шэрагу патрыятычных праектаў, прысвечаных 75-й гадавіне легендарнага Парада 1941 года ў Куйбышаве Стар. 3



**Вельмі блізкія суседзі**

Беларускае зямляцтва на Браншчыне адзначыла 10-гадовы юбілей Стар. 3



**Байдаркі на вадзе**

Сезон для аматараў водных вандровак у Беларусі доўжыцца, пакуль на рэчках не стане лёд Стар. 4

ЖЫВЫЯ ТРАДЫЦЫІ

# Стыльна, модна, самабытна

## На адным са старэйшых прадпрыемстваў народных рамёстваў “Скарбніца” шыюць нацыянальныя касцюмы ў тым ліку і для беларусаў замежжа

Кацярына Мядзведская

Што такое паказ мод? У галаве з’яўляюцца вобразы: мадэльнай знешнасці дзяўчаты, подыум, туфлі-шпількі, гледачы, адзенне — часам і не надта зразумелае... А бывае інакш. Нядаўна пабачыла паказ нацыянальных строяў з розных куткоў Беларусі. Няспешна выходзілі дзяўчаты, прычым не прафесійныя мадэлі, а мастачкі, дызайнеркі, швачкі прадпрыемства “Скарбніца”, аднаго са старэйшых у галіне беларускіх народных рамёстваў. Гукі музыкі ды голас зязюлі, што чуўся час ад часу, пераносілі далёка за межы горада, бліжэй да прыроды, у вёску. Здавалася, можна было дакрануцца да высокіх пачуццяў, што ўзнікалі пад час прагляду гэткага дэфіле: настолькі цёплымі яны былі, натуральнымі. “Без анівкага сілікону”, — дадаў бы мой добры знаёмы, кіраўнік народнага ансамбля беларускай песні “Вербіца” Алесь Свірскі. А ўяўленне жыва малявала вобразы: жытнёвае поле, чысцюткая празрыстая вада ў рэчцы, ласкавае сонейка, неба васількавага колеру...



КАЦЯРЫНА МЯДЗВЕДСКАЯ

На дэфіле ад “Скарбніцы” быў прадстаўлены і строй з Лельчыцкага раёна Гомельшчыны

Прадстаўленыя касцюмы — гэта дакладныя рэканструкцыі строяў з Чачэрскага, Рагачоўскага, Добрушскага, Кобрынскага, Жыткавіцкага, Маларыцкага, Любаньскага раёнаў, Неглюбкі, Давыд-Гарадка... Якое буянне фарбаў, формаў, вышываных узораў ды патаемных сімвалаў! Сапраўды, нацыянальныя строі — найкаштоўны скарб, што дастаўся нам ад продкаў. Мастацтвазнаўца Міхась Раманюк у прадмове да свайго альбома “Беларускія народныя строі” пісаў: “Лічыцца, што пасля мовы народнае адзенне — найбольш важная этнічная прыкмета. Строй беларускіх сялян цалкам адпавядаў таму эстэтычнаму ідэалу прыгажосці, што выяўляўся ў мелодыі народнай песні, гуках народных інструментаў, пластыцы традыцыйнага танцу”.

Штогод на працягу ўсёй гісторыі “Скарбніцы”, а сёлета прадпрыемству 40 гадоў, яе навуковыя супрацоўнікі, мастакі, дызайнеры выпрацоўваюцца ў экспедыцыі. Па назбіраных “на месцах” матэрыялах і ствараюцца рэканструкцыі. Вядучы мастак прадпрыемства Алена Галіеўская расказала мне гісторыю вяртання жаночага мяшчанскага касцюма з Давыд-Гарадка: “Нагадаю, што строй — гэта ўвесь комплекс адзення: ад галаўнога ўбору і да абутку. Пад час экспедыцыі ў Давыд-Гарадок мы вывучалі касцюмы, якія шыюць мясцовыя жыхаркі па тых узорах, што засталіся ім ад бабуль. Канешне, яны вельмі падобныя на той строй, што атрымаўся ў нас”.

→ Стар. 4

ВЕСТКІ

## Настаўнік нашага часу

**Педагог з Магілёва Валеры Барашкоў атрымаў званне “народнага”**

Упершыню ў краіне прысвоена ганаровае званне “Народны настаўнік Беларусі”. Адпаведны Указ падпісаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка. Першым ушанаваны педагог з Магілёва Валеры Васілевіч Барашкоў.

Як паведамляецца ў газеце “СБ. Беларусь сегодня” (№228, 26.11.2016), настаўнік фізікі абласнога ліцэя №1 Валеры Барашкоў, калі яму па тэлефоне аб’явілі пра ўзнагароду, адразу не паверыў: “Думаў — розыгрыш. Народных настаўнікаў у нас ніколі не было... Іншая справа — артысты…”

У галіне адукацыі Валеры Васілевіч працуе больш за 40 гадоў. Спачатку вёў заняткі ў сельскай школе, і ўжо 26 гадоў выкладае фізіку ў магілёўскім ліцэі. Складаныя тэрміны ды формулы ён растлумачвае ліцэістам так, што нават “гуманітарыі” ведаюць фізіку на выдатна. А славу настаўнікам, як вядома, робяць іх вучні. Падлічана: каля 200 з вучняў народнага настаўніка Барашкова ў розны час станавіліся прызёрамі, пераможцамі абласных, рэспубліканскіх, міжнародных алімпіяд. А некаторыя, закончыўшы “фізфак”, працуюць па спецыяльнасці. Ёсць і тыя, хто пайшоў у навуку.

З атрыманнем высокага звання віншуюць настаўніка як цяперашнія ліцэісты, так і былыя вучні. Сам жа Валеры Барашкоў да ўзнагароды ставіцца па-філасофску. Кажа, што настаўнік — гэта не дыплом, а прызванне, і што сапраўдных педагогаў у краіне шмат.

СУПОЛЬНАСЦЬ

# Умеем жыць у згодзе

**Нацыянальныя суполкі, якія дзейнічаюць у нашай краіне, — гэта самы талерантны складнік грамадзянскай супольнасці Беларусі**

Выступаючы на пасяджэнні круглага стала “Роля і месца нацыянальных аб’яднанняў у зберажэнні ды ўмацаванні міру і згоды ў Рэспубліцы Беларусь”, які праходзіў у Мінску, я падкрэсліла: сама беларуская дзяржава пастаянна задае высокі, даверлівы ўзровень дыялогу ў выбудоўванні цывілізаваных стасункаў паміж тытульным і нятытульным этнасамі. Не памылюся, калі скажу: любы замежны эксперт, палітык, дзяржаўны дзеяч, які думае, жыве па законах сумлення, пагодзіцца з такім тэзісам. Кіруючая палітычная эліта нашай Бацькаўшчыны лічыць, што ёсць беларусы ў шырокім сэнсе слова і беларусы ў вузкім сэнсе слова. Першае значэнне — гэта сукупнасць усіх грамадзян нашай краіны, другое — гэта людзі, у якіх у савецкі час пяты пункт у пашпарце быў сфармуляваны як “беларус”, “беларуска”. Як вядома, акрамя этнічных беларусаў на гэтай зямлі здаўна, стагоддзямі жывуць прадстаўнікі іншых народаў. Гэта гістарычная рэальнасць. Наша Бацькаўшчына называецца Беларусь — па назве тытульнага этнасу. А мы, прадстаўнікі этнасаў нятытульных, і ёсць беларусы ў шырокім сэнсе слова. І гэта проста выдатна! У такім паважлівым стаўленні да грамадзян іншай нацыянальнасці на дзяржаўным узроўні я бачу і адну з галоўных прычын захавання міру і згоды паміж усімі народамі Беларусі. Я б нават сказала: мы маем справу з такім феноменам, як Аб’яднаныя Нацыі Беларусі.

Ведаю многіх актывістаў з розных этнасуполак. Заўважала, што звычайна сябар нацыянальнага аб’яднання разважае так: спачатку я беларус у шырокім сэнсе слова, а затым — яўрэй, украінец, татарын... І гэта норма для сучаснай Беларусі. Такі вобраз мыслення ставіць трывалы заслон для крайняга нацыяналізму, грэблівага стаўлення да прадстаўнікоў іншых народаў. Тэзіс пра беларусаў у шырокім сэнсе слова арганічна суадносіцца з акцэнтам на агульначалавечыя каштоўнасці ў ідэалогіі беларускай дзяржавы. І тое, і другое мае важнае значэнне для прадстаўнікоў усіх этнасупольнасцяў Беларусі, яе шматнацыянальнага народа.

Я ўзначальваю Салігорскае яўрэйскае грамадскае аб’яднанне. Наша суполка пастаянна атрымлівае



Помнік ахвярам Халакосту

дзейсную падтрымку з боку ўладных структур, іншых этнасуполак. І найбольш яскрава тое праявілася, калі вырашалася пытанне аб увекавечанні памяці ахвяр Халакосту ў нашых мясцінах. → Стар. 3

ЭСТАФЕТА ПАКАЛЕННЯЎ

# Парад памяці ў Самары

## Беларусы з горада на Волзе паўдзельнічалі ў шэрагу патрыятычных праектаў, прысвечаных 75-й гадавіне легендарнага Парада 1941 года ў Куйбышаве

Рыхталіся да знамянальнай падзеі нашы супляменнікі ў Самары. У прыватнасці, заснавалі, арганізавалі шматнацыянальны патрыятычны фестываль-конкурс "Живем и помним!", які завяршыўся грандыёзным Гала-канцэртам. Увогуле з часу заснавання Самарская абласная грамадская арганізацыя беларусаў і выхадцаў з Беларусі "Руска-беларускае братэрства 2000" асаблівую ўвагу надае кантактам з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, працаўнікамі тылу. Творчыя гурты суполкі выступаюць перад імі з канцэртамі, віншуюць іх са святамі, разам адзначаюць іх дні нараджэння, юбілеі. Няпростыя лёсы ў людзей старэйшага пакалення: вайна, пасляваенная разруха, голад і цяжкая праца па аднаўленні разбуранай гаспадаркі... Так жыла і найстарэйшая прадстаўніца беларусаў вобласці Марыя Ягораўна Белаглазава, якая 9 кастрычніка адзначыла 90-ы дзень нараджэння. Супляменнікі павіншавалі яе з юбілеем.

У шосты раз праходзіў Парад памяці ў Самары. Падрыхтоўку да яго беларусы вобласці вялі, складаючы рэестр тых, хто пайшоў на фронт з Куйбышаўскай вобласці, хто загінуў, абараняючы і вызваляючы Беларусь і пахаваны ў беларускай зямлі. Праект — на гады: вядома, напрыклад, што толькі на Віцебшчыне пахавана 2546 ураджэнцаў Куйбышаўскай вобласці, а ўсяго ў Беларусі — 6184 пахаваныя куйбышаўцаў. Таму праўленне, актыў суполкі просіць беларускіх пошукавікаў, работнікаў беларускіх архіваў, усіх, хто мае інфармацыю пра пахаванні воінаў Куйбышаўскай вобласці ў Беларусі, дасылаць інфармацыю на эладрас ivankorablev@yandex.ru.

"Нашы падрыхтоўка і ўдзел у Парадзе памяці — гэта ў першую чаргу даніна памяці тым,хто бараніў Айчыну на фронце, хто самааддана працаваў у тыле, — гаворыць прэзідэнт суполкі Ірына Глуская. — Памятаць пра іх, рабіць усё магчымае, каб і маладое пакаленне памятала і ганарылася тымі, хто змагаўся і аддаў жыццё за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы — святы абавязак усіх нашчадкаў герояў". Да патрыятычнай ініцыятывы беларусаў Самары з разуменнем ставяцца ў Беларусі. У адрас суполкі прыходзяць лісты, фатаграфіі з месцаў пахаванняў воінаў-куйбышаўцаў. Напрыклад, Яна Ігараўна Кавалёва, настаўніца сярэдняй школы вёскі Церуха (Гомельскі раён) напісала: "У нашых мясцінах ваяваў Герой Савецкага Саюза гвардыі малодшы сяржант, кулямётчык 118-га гвардзейскага стралковага палка 37-й гвардзейскай стралковай дывізіі 65-й арміі Цэнтральнага фронту Аляксандр Дзмітрыевіч Валогін. Ён 1924 года нараджэння, ураджэнец вёскі Пячэрскае цяпер Сызранскага раёна Самарскай вобласці. Загінуў 17 кастрычніка 1943 года, пахаваны на брацкім мемарыяле вёскі Церуха".



**На Парадзе памяці было месца і Герою-беларусу Мікалаю Шарко**

Настаўніца паведамляе, што ў Цярухскай школе ёсць музей, дзе сабраны рэчы даўняга побыту мясцовых жыхароў, можна даведацца пра гісторыю школы, вуліц, адзення, жыхароў вёскі. На стэндзе "1941-1945. Вайна, народ, Перамога" размешчаны матэрыялы пра вяскоўцаў, якія сталі ўдзельнікамі вайны, яе ахвярамі. Вучні са школы юнага экскурсавода стварылі пры музеі альбомы "І помніць страшна, і забыць нельга", "Юнацтва нашых бабуль" ды іншыя. Музей пастаянна папаўняецца экспанатамі. І гэта правільна, дадае настаўніца, згадвае даўнюю мудрасць: народ, які сёння застаўся без мінулага, заўтра застанецца без хлеба.

Актывісты моладзевага аддзялення самарскай арганізацыі напярэдадні Параду правялі экспрэс-апытанне сяброў суполкі, людзей, якія жылі або вучыліся ў Беларусі. Папрасілі расказаць, хто са сваякоў удзельнічаў у вайне. "Мой дзядуля, Іван Васілевіч Плотнікаў, 1907 года нараджэння, у гады вайны быў шафёрам, вазіў боепрыпасы артылерыстам, — падзяліўся ўспамінамі Віктар Мікалаевіч Кандрацэнка, палкоўнік у адстаўцы, ураджэнец Магілёва, жыхар Самары. — Дзед быў узнагароджаны медалём "За баявыя заслугі", ордэнам Чырвонай Зоркі. Пад час баявых дзеянняў быў кантужаны. Ён быў годным чалавекам, ваяваў за Каўказ, удзельнічаў у вызваленні Украіны. Вайну закончыў у Вене ў 1945-м".

Ваявалі абодва дзядулі Аляксандра Барысавіча Фяцісава, намесніка старшыні Урада Самарскай вобласці, палкоўніка ў запасе. А сам ён у 1988 годзе з адзнакай і залатым медалём закончыў Мінскае вышэйшае ваенна-палітычнае агульнавайсковае вучылішча. Дзясяткі тысяч ураджэнцаў Куйбышаўскай вобласці-удзельнікаў вайны ўшанаваны ардэнамі, медалямі СССР. 230 з іх удастоены звання Герой Савецкага Саюза, 26 сталі поўнымі кавалерамі салдацкага ордэна Славы. А ўсяго звыш 226 тысяч куйбышаўцаў не вярнуліся дадому з палёў бітваў, загінулі за свабоду і незалежнасць Радзімы.

Парад памяці спалучае розныя пакаленні, нагадвае: мы — нашчадкі вялікага подзвігу нашых дзядоў і прадзедаў. Адным з самых эмацыйных момантаў Параду было праходжанне Геройскага палка... Нібы ў далёкім 41-м усталі плячом да пляча шматнацыянальныя парадныя разлікі, і ў тых шэрагах былі Героі Савецкага Саюза армянін Уладзімір Акопавіч Яўрумаў, беларус Мікалай Піліпавіч Шарко, рускі Іван Міхайлавіч Ледакоў... Геройскі полк аб'яднаў у сабе ўсе гістарычныя тэмы пяці папярэдніх Парадаў: Героі — працаўнікі тылу, Героі — суворацы і нахімаўцы, Героі розных нацыянальнасцяў і народаў з тэрыторый былога Савецкага Саюза, Героі Расіі. Упершыню сёлета ўшанавалі Герояў спорту, якія заслужылі вышэйшыя ўзнагароды, сталі алімпійскімі чэмпіёнамі, пераможцамі чэмпіянатаў свету і Еўропы. А прадстаўнікі беларусаў Самарскай вобласці (Ірына Глуская, Анатоль Рапецкі, Мікалай Міцяшын, Іван Еўграфаў ды іншыя) у парадным разліку Памяці неслі партрэты сваіх родных і блізкіх, якія ваявалі на франтах Вялікай Айчыннай.

Ганаровым госцем і Голасам шостага Параду памяці ў другі раз быў народны артыст СССР Васіль Ланавы, які ў сваіх ролях увасобіў лепшыя рысы характараў сапраўдных рускіх афіцэраў. Пасля Параду Васіль Сямёнавіч іграў монаспектакль "Спасибо за верность, потомки!" ў Акруговым доме афіцэраў.

**Мікалай Бойка,** г. Самара

СУСТРЭЧЫ

# Глыток паветра з Бацькаўшчыны

**"Родныя напевы" — пад такою назвай у эстонскім горадзе Кохтла-Ярве прайшоў Трэці фестываль беларускай песні**

Арганізавала свята беларускае культурнае таварыства "БЭЗ", якім кіруе Зінаіда Клыга. Назва суполкі, нагадаю, мае два значэнні. Папершае, гэта — абрэвіятура ад назвы "Беларуска-Эстонскае Згуртаванне". Па-другое, "бэз" — па-руску "сирень". І эмблема суполкі — галінка з прыгожымі пахкімі кветкамі бэзу.

Гасцямі ды ўдзельнікамі фестывалю сталі ансамблі беларускай песні Талінскага беларускага культурнага таварыства "Лёс", Беларускага культурнага таварыства "Ялінка" з г. Маарду. Выступаў ансамбль беларускай песні з нашай нарвскай суполкі "Сябры". Спявалі, канешне ж, і гаспадары. Чаканымі гасцямі сталі артысты з Беларусі: Салігорскага раёна ды Салігорска, горада-пабраціма Кохтла-Ярве. Прыехалі трыа цымбалістак "Натхненне" і вакальны гурт "Заранка". Узначаліла дэлегацыю Наталля Навіцкая, дэпутатка Салігорскага райсавета дэпутатаў.

Больш за дзве гадзіны на сцэне Культурнага цэнтра гучалі беларускія песні, музыка. Прыгожыя касцюмы, вясёлыя ды лірычныя песні анікога не пакінулі абыякавымі. Гледачы атрымалі асалоду ад народных і сучасных кампазіцый у выкананні артыстаў з Салігорска. Іх сустракалі бурнымі апладысментамі.



ВІКТАР БАЙКАЧОЎ

**На сцэне фестывалю — госці з Салігоршчыны**

А напярэдадні салігорскія госці разам з мясцовым ансамблем "Каліна красная" далі вялікі канцэрт у мызе Мяэтагузе для жыхароў воласці. За гэта ім асобная падзяка ад эстонскіх гледачоў!

Ганаровымі гасцямі фестывалю былі Пасол Беларусі ў Эстоніі Анатоль Сцепусь, кіраўнік парламенцкай групы "Эстонія—Беларусь", дэпутат эстонскага парламента Валеры Корб, мэр Кохтла-Ярве Людміла Янчанка, прадстаўнік Мінкультуры Эстоніі Эдуард Адзінец, павятовы сакратар Іда-Вірумаа Эве Эаст, валасны старэйшына Йыхві Эдуард Эаст, кіраўнік "круглага стала" пры старэйшыне Іда-Вірумаа Аляксандр Дусман і прадстаўнікі мясцовых самакіраванняў Паўночнага Усходу Эстоніі. Шмат падарункаў, кветак было ўручана ўсім удзельнікам. Завяршэннем імпрэзы стала сумеснае выкананне ўсімі развітальнай песні "Чарка на пасашок". Як і належыць паводле народнай традыцыі, яе й гледачы сустрэлі стоячы. А пасля канцэрта ўсе ўдзельнікі змаглі бліжэй пазнаёміцца адзін з адным. Сяброўскія гутаркі з артыстамі гурта "Заранка" на роднай беларускай мове былі для ўсіх нас, беларусаў Эстоніі, своеасаблівым глытком паветра з Бацькаўшчыны.

**Віктар Байкачоў,** г. Нарва, Эстонія

З НАГОДЫ

# Добрая вестка з Астаны

**Выданне "Беларусь. Краіна і людзі" ўдастоена залатога медаля на кніжнай выставе-кірмашы ў сталіцы Казахстана**

Скарынаўскія традыцыі беларускага кнігадрукавання годна прадаўжаюцца. Пра тое сведчыць вестка з Астаны: выданне "Беларусь. Краіна і людзі" ўдастоена залатога медаля і дыплома І ступені за перамогу ў намінацыі "Лепшае краязнаўчае выданне" конкурсу Еўразійскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу Eurasian Book Fair-2016 у Астане.

Кніга выйшла ў выдавецтве "Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі" да V Усебеларускага народнага сходу. Фотаальбом адлюстроўвае сучаснае жыццё краіны. Спачатку выйшаў руска-англійскі варыянт, потым беларуска-англійскі. Кніга прызначана для шырокага кола чытачоў, у тым ліку і замежнікаў.

Адзначаны дыпломамі ў Астане таксама іншыя беларускія выданні.

СУПОЛЬНАСЦЬ

# Умеем жыць у згодзе

**(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)**

Сёлета былі адкрыты два помнікі ў вёсцы Пагост нашага раёна. Спагадлівасць сярод неяўрэяў была такою, што я згадвала словы Віктора Гюго: "Тое, што памерла як рэальнасць, жывое як навучанне". Мяне кранула і ўсхвалявала, што на адкрыцці помнікаў здзяйснялі культавыя дзеі прадстаўнікі розных рэлігій. Да і не сакрэт, што іудаізм, хрысціянства, іслам выраслі з аднаго кораня.

Для нас, актывістаў этнасуполак, нацыянальнасць і вера — гэта тое, што робіць чалавека адметным. Непаўторным. Мы часта гасцюем на святах, якія арганізуюцца іншымі суполкамі, а яны прыходзяць на нашыя святы. Калі сябры з іншых этнасуполак ядуць з намі мацу, далучаюцца да тых, хто танцуе "Сем сорак", спявае "Хава нагіла" — я, паверце, адчуваю душэўны камфорт. Бачыла: у славянскіх жанчын слёзы накатваліся, калі яны слухалі песню "Аідэшэ мамэ". Мацуе міжнацыянальную згоду і тое, што неяўрэі цікавяцца праўдзівай гісторыяй пра яўрэйскі народ. Наша суполка, напрыклад, спрычынілася да выхаду кнігі прафесара, доктара навук Міхаіла Стральца "Евреи Германии: история и современность".

Пра тое, што ў Беларусі высокакультурнае, талерантнае грамадства, сведчаць і многія змешаныя шлюбы, калі муж і жонка не адной нацыянальнасці. Падобныя сем'і пераважаюць і ў нашай суполцы. Я ніколі не чула, каб паміж мужам і жонкай быў канфлікт з-за ўдзелу ў справах грамады. А сакрэт, падаецца мне, просты: ён у тым грамадскім клімаце, у той міжнацыянальнай сітуацыі пад назвай "Аб'яднаныя Нацыі Беларусі", якая стагоддзямі стваралася на беларускіх землях — і цяпер умела падтрымліваецца ўладамі беларускай дзяржавы.

Этнааб'яднанні ў Беларусі цяпер узначальваюць прадказальныя лідэры без экстрэмісцкіх настрояў. Яны адэкватна ацэньваюць і межы, і магчымасці грамадзянскай супольнасці ў выбудоўванні цывілізаваных этнаканфесійных адносін. Выяўляючы разважлівасць і мудрасць, яны ніколі не апускаюцца да таго, каб разыгрываць нейкія фобіі. Я ўвесь час пераконваюся ў тым, маючы з імі сяброўскія зносіны.

**Яўгенія Яфімава,**
старшыня праўлення
Салігорскага яўрэйскага
грамадскага аб'яднання



**Пры адкрыцці помніка ахвярам нацызму выступае ветэран вайны Віктар Цесавец**



**Помнік у вёсцы Пагост**

## Ад рэдакцыі

Нататкі падрыхтаваны паводле выступлення Яўгеніі Яфімавай на нядаўнім круглым стале. Мерапрыемства тое, нагадаем, прайшло ў Мінску, ладзілі яго Міністэрства юстыцыі з удзелам Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, у зале былі актывісты, прадстаўнікі больш чым 30-ці нацыянальных грамадскіх суполак, зарэгістраваных у Беларусі. Наша газета пісала пра падзею ў тэксце "Дыялог вядзе да згоды" (ГР, 11.11.2016).
Яўгенія Васільеўна патлумачыла: два новыя помнікі ў вёсцы Пагост устаноўлены замест ранейшых, старых, пастаўленых з цэглы яшчэ ў 1944 годзе. Надпісы на іх сведчаць пра кольксасць яўрэяў, расстраляных гітлераўцамі: 440 і 180 чалавек. Новыя помнікі ўзведзены пры ўдзеле Фонду імя Саймана Майкла Лазаруса (Вялікабрытанія). "Нікога не пакінулі абыякавымі ўспаміны сведкаў трагедыі: заслужанай настаўніцы Беларусі Людмілы Дубоўскай і настаўніка Віктара Цесаўца, — так пісала пра падзею газета "АВИВ". — Аддаць даніну памяці расстраляным прыйшлі таксама мясцовыя жыхары і школьнікі". Як расказала Яўгенія Яфімава, адна з ініцыятарак аднаўлення помнікаў — мясцовая жыхарка Людміла Іванаўна Дубоўская. Гэта яна, сведка трагедыі, прасіла актывістаў Салігорскага яўрэйскага грамадскага аб'яднання прыкласці ўсе намаганні, каб яшчэ пры яе жыцці ў Пагосце з'явіліся новыя помнікі, бо сярод расстраляных былі і яе школьныя сябры. Дома Людміла Іванаўна зберагае здымкі тых аднакласнікаў, з якімі разам у 1941-м закончыла восьмы клас. Сведкам трагедыі быў і Віктар Цімафеевіч Цесавец, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны з вёскі Чыжэвічы.

ЯК СПРАВЫ, ДЫЯСПАРА?

# Вельмі блізкія суседзі

**Беларускае зямляцтва на Браншчыне адзначыла 10-гадовы юбілей**

Урачыстасць з нагоды юбілею абласной грамадскай арганізацыі "Беларускае зямляцтва на Браншчыне" праходзіла ў Палацы культуры чыгуначнікаў. Сярод ганаровых гасцей былі намеснік губернатара Аляксандр Карабко, намеснік старшыні Бранскай абласной Думы Анатоль Бугаёў, намеснік кіраўніка гарадской адміністрацыі Бранска Людміла Ганчарова, кіраўнікі адміністрацый Савецкага і Фокінскага раёнаў. Са Смаленска прыбыў павіншаваць супляменнікаў кіраўнік Аддзялення Пасольства Беларусі ў Расіі Чэслаў Шульга. Прыйшлі студэнты-беларусы, якія навучаюцца ў ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных установах, лідэры нацыянальных суполак (армянаў, грузінаў, гагаузаў, яўрэяў, палякаў, дагестанцаў), грамадскіх арганізацый вобласці, сябры зямляцтва, жыхары горада, вобласці.

Кіраўнік зямляцтва Мікалай Голасаў адзначыў: суполка створана беларусамі, якія сваімі справамі ўмацоўваюць сяброўства і супрацоўніцтва паміж брацкімі народамі Беларусі ды Расіі, імкнуцца захаваць сваю самабытнасць, культуру. Як вядома, калі распаўся Савецкі Саюз, то парываліся сувязі паміж людзьмі. Зямляцтва шмат папрацавала на ніве народнай дыпламатыі — таму ёсць і вынікі. Умацоўваюцца разнабаковыя сувязі Браншчыны з Беларуссю.

Цяпер жыхары Браншчыны звяртаюцца да нас па розных пытаннях. Актывісты суполкі спрыяюць пошуку людзей, дакументаў, аказваюць дапамогу ў набыцці пуцёвак у санаторыі, дапамагаюць устанавіць месца гібелі родных людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны, арганізаваць выставы, выступленні творчых калектываў, знайсці працу… "Звяртаюцца да нас і беларусы, якія трапілі ў складаныя сітуацыі, — гаварыў Мікалай Іванавіч. — Зямляцтва ператварылася ў свайго роду грамадскае прадстаўніцтва Беларусі ў Бранску. І мы стараемся вырашаць праблемы праз сяброў зямляцтва, сярод якіх ёсць дэпутаты рознага ўзроўню, камерсанты, урачы, настаўнікі, творчыя работнікі, студэнты..." Нагадаю, што сам Мікалай Голасаў — чалавек аўтарытэтны: член Грамадскай палаты вобласці, член Грамадскага савета пры УМВД, член экспертнага савета пры Упаўнаважаным па правах чалавека, член Савета па нацыянальных пытаннях пры Урадзе вобласці, памочнік дэпутата Дзяржаўнай Думы VI склікання. Уваходзяць у склад грамадскіх структур пры розных галінах улады таксама іншыя сябры зямляцтва. Аўтар гэтых радкоў — кіраўніца моладзевага крыла суполкі, працую ў складзе Грамадскага савета пры мэры Бранска. Наш сябар Дзмітры Канаваленка — член маладзёжнага парламента вобласці, адзін з заснавальнікаў Агульнарасійскага народнага фронту. Дзякуючы такім акалічнасцям зямляцтва мае магчымасці больш эфектыўна кантактаваць з органамі ўлады, іншымі грамадскімі структурамі.

Высока ацэньвае дзейнасць зямляцтва Урад вобласці. Сярод этнасуполак Браншчыны беларуская — адна з найактыўных, яна спрыяе развіццю міжнацыянальнага дыялогу ў рэгіёне. Актывісты ўдзельнічалі ў форуме "Міжрэгіянальнае супрацоўніцтва Бранскай і Магілёўскай абласцей у сферы маладзёжнай палітыкі ў рамках Саюзнай дзяржавы". Форум праходзіў сёлета ў Магілёве. Прадстаўнікі зямляцтва — жаданыя госці на ўсіх святочных мерапрыемствах, якія праводзяцца ў Бранску і вобласці. Мы сярод тых, хто адзначае такія святы, як Дзень Расіі, Дзень народнага адзінства, Дзень вызвалення Бранскай вобласці, Дзень Перамогі.

Намеснік губернатара Аляксандр Карабко, віншуючы суполку, адзначыў: "Беларускага зямляцтва на Браншчыне проста не магло не быць! Ваша арганізацыя — наш даўні сябар і памочнік у пытаннях рэалізацыі стратэгіі нацыянальнай палітыкі. Ва Урад вобласці паступае шмат цікавых прапаноў, ідэй ад вашай арганізацыі". Ярка, эмацыйна выступіў намеснік старшыні абласной Думы Анатоль Бугаёў: гаварыў пра дружбу беларускага і расійскага народаў, якія маюць агульныя карані, гісторыю, лёс. "Беларускае зямляцтва ў Бранску мае шэраг традыцый, якія адрозніваюць яго ад суполак у іншых гарадах, — адзначыў беларускі дыпламат Чэслаў Шульга. — Менавіта тут адчуваецца наш нацыянальны каларыт. Вядзецца і патрыятычная праца, тым болей што Браншчыну і Беларусь аб'ядноўвае ў вайну партызанскі рух. Асаблівае значэнне мы надаём і гандлёва-эканамічным адносінам. Сёлетнія эканамічныя форумы сведчаць пра моцныя, сяброўскія кантакты, і прыемна, што беларусы Браншчыны актыўна спрыяюць іх умацаванню". Чэслаў Шульга ўручыў кіраўніку зямляцтва Падзяку ад Пасла Беларусі ў Расіі Ігара Петрышэнкі. Падзяку Мікалаю Голасаву накіравала і кіраўніцтва Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі "Беларусы Расіі".

Кіраўнікі горада, раёнаў, лідэры абшчын, грамадскіх суполак таксама віншавалі зямляцтва з юбілеем, звярталі ўвагу на яго важную ролю ў жыцці рэгіёну, вялікі аўтарытэт. Найбольш актыўныя сябры зямляцтва ўшанаваны граматамі, падзячнымі лістамі, адзначаны падарункамі.

Потым выступалі самадзейныя калектывы. Цёпла гучалі песні на беларускай мове, якія спявалі сябры зямляцтва ў нацыянальных строях. Мясцовыя СМІ падрыхтавалі матэрыялы аб дзейнасці зямляцтва, павіншавалі беларусаў з юбілеем.




**Годна адзначылі беларусы Браншчыны юбілей суполкі**

**Кацярына Коладава,**
намесніца старшыні
праўлення Беларускага
зямляцтва на Браншчыне

**РОДНЫ БЕРАГ**

# Байдаркі на вадзе

## Сезон для аматараў водных вандровак у Беларусі доўжыцца, пакуль на рэчках не стане лёд

**Іван Ждановіч**



ДЗМІТРЫ МАЛАДЗЕНКАЎ

**Водныя вандроўкі ў восеньскую пару маюць сваю непаўторную прыгажосць**



**Вяслуе Іван Церпілоўскі**

Прага вандраванняў — гэта асаблівы, камфортна-хвалюючы стан душы. Пра тое згадалася, калі слухаў аповеды Дзмітрыя Маладзенкава, водніка-пачаткоўца. Малады спецыяліст-энергетык у захапленні ад нядаўніх паходаў па Беларусі, па карэльскай рацэ Сума — аж да Белага мора. Дзмітры праслухаў курс лекцый у Школе пачатковай турпадрыхтоўкі, на базе турклуба "Альтаір" пры Белдзяржуніверсітэце інфарматыкі ды радыёэлектронікі. А далучаюцца там да паходаў не толькі студэнты БДУІР. Дарэчы, і мае вандроўкі пачаліся ў студэнцтве: на пачатку 80-х, пад час вучобы ў Ленінградскім дзяржуніверсітэце. Хадзілі мы на байдарцы з аднакурснікамі: Алегу Антонаву на Алтай, Мікалаю Галянкову ў Саранск, Анатолію Грашневікову (дэпутату Дзяржаўнай Думы) у Маскву — маё прывітанне. Нам адкрывалі свае незабыўныя краявіды дзівосная рэчка Вуокса, наравістае Ладажскае возера ў раёне Прыазёрска... Але тое ўвесну ды ўвосень. А лёд на байдарках, і ранішні лістападаўскі іней на палатках пабачыў з аматарамі водных вандровак з Гродна: хадзілі разам у сярэдзіне 80-х па маршруце Ула—Мяркіс—Нямунас (так Нёман у Літве называюць). І былі яшчэ дзве вандроўкі па Нёмане ўніз ад Стоўбцаў…

Вернемся ў Мінск. Праводзіць заняткі у Школе пачатковай турпадрыхтоўкі сапраўдны фанат воднага турызму, інструктар Іван Церпілоўскі. "З трох гадоў у паходы хаджу, а сам кіраваў першым у гадоў 17…" — з усмешкай згадаў шлях у турызм Іван Анатолевіч. Настаўнікам называе вядомага водніка Анатоля Міхайлавіча Юркевіча. Прычым спавядае Іван не "адпачынак на вадзе", а спартыўны турызм, і стратэгія такая: набірае курсы для пачаткоўцаў, дае тэорыю, а потым — у паходы. Спачатку — больш простыя, па рэках Беларусі: прыглядзецца, хто ёсць хто. "Сёлета з курсантамі сезон адкрылі ў маі на Іслачы, — дзеліцца досведам Іван Церпілоўскі. — Там ёсць прыгожы маршрут першай катэгорыі Іслач—Заходняя Бярэзіна—Нёман. Ішло аж 32 чалавекі, за 7 дзён — 170 кіламетраў".

Хто прайшоў без ныцця "воднае хрышчэнне", той потым умацоўваў дух і мускулы, набіраўся досведу ў летнім, больш складаным паходзе ў Карэліі, на рэчцы Сума. Дзмітры расказаў, як даводзілася разбіраць шматлікія завалы, праводзіць байдаркі цераз перашкоды па пояс у сцюдзёнай вадзе. І пра паходную лазню, якую ўмеюць ладзіць воднікі, і пра цэлую процьму камароў ды машкі… Так што "долго будет Карелия сниться"!

А Іван Церпілоўскі звадзіў сёлета беларускую групу на катамаранах і па грузінскіх рэчках Рыоні ды Цхенісцхалі. Як сустракалі беларусаў грузіны? "Вельмі гасцінна! — згадвае Іван. — Там як толькі хто сустрэў нас на стаянцы — адразу: генацвале, ты на маёй зямлі — ты мой госць. Частавалі ад душы, прыгожыя размовы вялі. Мяркую, і такія паходы спрыяюць умацаванню сяброўства паміж народамі. Своеасаблівая народныя дыпламатыя".

Замежных беларусаў у паходах, якія ладзіць Іван Церпілоўскі, пакуль не было. Але ён гатовы да такога супрацоўніцтва. Электронны адрас для сувязі: terpilovskii@mail.ru. Кажа, будуць ахвочыя — можна правесці азнаямленчыя туры па беларускіх рэчках і азёрах. Маршрутаў вельмі шмат, на любыя густы і запатрабаванні. У інтэрнэце можна паглядзець, якія з іх выбраць, у тым ліку і з фотаздымкамі, відэа, падрабязнымі апісаннямі маршрутаў, асаблівасцяў іх праходжання, месцаў для зручных стаянак. Са справаздач бачна: беларускія воднікі ходзяць у паходы і па рэчках Каўказа, Алтая, Карэліі — маршруты вядомыя з савецкіх часоў. У пашане, асабліва сярод пачаткоўцаў ды студэнтаў, і водныя паходы па Беларусі. Вось, скажам, урывак нататкаў з нядаўняга, восеньскага паходу, які праводзіў Андрэй Вашкоў па рэчцы Вярхіта, прытоку Чэрніцы і Лучосы: "У камандзе 12 чалавек — студэнты-геолагі, былыя студэнты-геолагі ды нашы сябры. Усе прайшлі жорсткі натуральны адбор. Каманда — тое што трэба, каб прайсці любую раку, нават без вады."

З такіх каментараў зразумела: пэўна, і халодная пара — не надта вялікая перашкода для вандровак турыстаў-воднікаў. Таму, заўважае Іван Церпілоўскі, сезон у іх доўжыцца, пакуль на рэчках не стане лёд. А сёлета восень цёплая была. То можа па беларускіх рэчках недзе яшчэ ідуць байдарачнікі. Пажадаем ім сем футаў пад кілем, добрых сяброў і ўражанняў!

**ЖЫВЫЯ ТРАДЫЦЫІ**

# Стыльна, модна, самабытна

**(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)**

Спецыялісты з Мінска звяртаюць увагу на дробязі: вышыўку, якасць тканіны, спосаб завязвання наміткі (галаўнога ўбора). "Мясцовыя жыхары ўсяго гэтага ўжо не ведаюць. Аднак багата тэматычнай літаратуры ёсць, напрыклад, у Музеі этнаграфіі ды фальклору НАН Беларусі, — працягвае Алена Галіеўская. — Шмат матэрыялу прывезлі з мясцовага краязнаўчага музея: фотаздымкі, замералі там розныя дэталі... Валодалі мы таксама інфармацыяй па тэхналогіі стварэння касцюма. Я бачыла швы, ведала, як рабіць зборкі. Пры дапамозе навуковага супрацоўніка Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Марыі Віннікавай быў адноўлены галаўны ўбор, які больш анідзе ў краіне ўжо не існуе. Карысталася я і альбомам Міхася Раманюка "Беларускія народныя строі", дзе ёсць фатаграфіі Давыд-Гарадоцкага строю. У кнізе Дзяніса Раманюка прадстаўлены строі ў малюнках. Таму і ў нашай рэканструкцыі добра вытрымана колеравая гама. Не ведаю, як так атрымоўваецца, але калі працуеш над касцюмам, то цалкам паглыбляешся ў яго, жывеш ім, дапрацоўваеш, прыдумваеш нешта… І трапляеш менавіта туды, куды трэба".

Азнаёміцца з калекцыяй рэканструяваных строяў, як, дарэчы, і з іншымі вырабамі — ручнікамі, паясамі, пакрываламі, сурвэткамі, абрусамі, сувенірамі з саломкі — можна ў музеі "Скарбніцы". На прадпрыемстве бываюць і наведнікі з экскурсіямі, глядзяць, як сёння на сапраўдных кроснах-ткацкіх станках працуюць жанчыны па старадаўніх "бабуліных" тэхналогіях.

Нядаўна у Гандлёвым цэнтры "Сталіца" адкрылася фірмовая крама прадпрыемства. Выбраць і заказаць рэчы, можна й на сайце "Скарбніцы". Як тое і робяць многія беларусы замежжа. Дарэчы, падпраграмай "Беларусы ў свеце" агульнай Дзяржпраграмы "Культура" на 2016-2020 гады прадугледжана дапамога супляменнікам у тым ліку і перадачай суполкам нацыянальных касцюмаў, сувеніраў. Нядаўна,скажам, ільняныя абрусы, сурвэткі, саламяныя вырабы былі перададзены асацыяцыі "Bellarus" у Італіі. Заказчыкам выступіў Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў. Беларуская суполка прымала ў сябе артыстаў праекта "Беларусь шматнацыянальная" ("Песня да Неапаля давяла", ГР, № 41, 3.11.2016).

Дарэчы, у творчай вандроўцы ў Італію паўдзельнічалі й супрацоўніцы "Скарбніцы". Дэманстраваліся там і строі. Прычым мадэлямі выступілі артысткі праекта, дзяўчаты розных нацыянальнасцяў. "Дзяўчаты — малайчынкі! — адзначала Алена Галіеўская. — Яны ж не навічкі на сцэне, умеюць на ёй трымацца. Касцюмы выглядалі дастойна". А раней рэканструяваныя беларускія строі пабачылі ў Аўстрыі, Славеніі, Польшчы.



КАЦЯРЫНА МЯДЗВЕДСКАЯ

**Алена Галіеўская з мадэлямі ад розных этнасуполак**

Некаторыя з удзельнікаў праекта "Беларусь шматнацыянальная" прыйшлі павіншаваць сяброў са "Скарбніцы" з 40-годдзем прадпрыемства. На святочным канцэрце, што прайшоў пасля дэфіле, выступілі ансамбль польскай песні "Іванчанка", ансамбль армянскага танца "Эрэбуні", салістка танцавальнага ансамбля "Арыранг" Асацыяцыі беларускіх карэйцаў Надзея Пазняк, спявачка Анастасія Гайдук. Былі таксама сябры-партнёры сярод гасцей: з апарата Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур, аб'яднання "Белхудожпромыслы", калегі з розных прадпрыемстваў народных рамёстваў.

Дырэктарка "Скарбніцы" Марыя Тарайковіч дзякавала ўсім за ўвагу, добрыя словы і падарункі. Казала: узрост прадпрыемства — зусім яшчэ малады, а справу і задум у калектыву — незлічоная колькасць.

На сайце ж "Скарбніцы", як дэвіз, вялікімі літарамі напісана: "Твая краіна скарбаў". То хай гэтыя скарбы множацца і трапляюць у кожную хату, у кожную сям'ю — як сувеніры, абярэгі, як напаміны аб роднай зямлі, традыцыях, каштоўнасцях, на якія нельга забыцца.

**Заснавальнік:** Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск
**Рэдактар** Віктар Міхайлавіч Харкоў
**Адрас рэдакцыі:** пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005
**Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61.** Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
**Бюро па рэкламе:** Тэл. +375 17 290 60 11
**Тэлефон рэдакцыі:** +375 17 288 17 82; факс: +375 17 290 68 31
**E—mail:** golas_radzimy@tut.by
**Аб'ём выдання:** 1 друк. арк.
**Тыраж:** 1935, **Заказ:** 1737
**Час падпісання ў друк:** 20.10
Выходзіць 1 раз на тыдзень
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.
© "Голас Радзімы", 2016